С37

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УО "БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ"

2016

# СОДРУЖЕСТВО НАУК. БАРАНОВИЧИ-2005

**МАТЕРИАЛЫ**
**МЕЖДУНАРОДНОЙ НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ МОЛОДЫХ ИССЛЕДОВАТЕЛЕЙ**

**22 февраля 2005 г.**
**г. Барановичи, Беларусь**

**В 2 частях**
**Часть 2**

Библиотека БарГУ
0010 8849

Барановичи 2005

31122
Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования
«Барановичский государственный университет»
БИБЛИОТЕКА

УДК 082(043.2)
ББК 94
С 57

*Печатается по решению совета Учреждения образования "Барановичский государственный университет", протокол № 5 от 28.01.2005 г.*

Рецензенты: доктор педагогических наук, профессор УО "Белорусский государственный университет имени Максима Танка" Л.Д. Глазырина; кандидат юридических наук, доцент Киевского национального экономического университета Е.В. Перепадя (Украина); доктор педагогических наук, профессор, Резекненская Высшая школа Велта Любкина (Латвия); доктор технических наук, профессор УО "Брестский государственный технический университет" Ю.Н. Павлючук; кандидат технических наук УО "Брестский государственный технический университет" А.В. Драган

Редакционная коллегия: В.И. Кочурко (главный редактор), П.П. Шоцкий, В.Н. Зуев, Е.И. Пономарева, К.С. Тристень, В.В. Хитрюк, С.К. Рындевич, Н.М. Сотник, Е.И. Белая, Е.Г. Карапетова, Э.И. Дмитриченко, М. Ассад, В.В. Таруц, Т.Н. Рыбина, Г.Я. Житкевич, В.Л. Гурский, Е.Л. Малиновский, А.В. Трофимчик, И.Д. Высотенко, А.А. Ковалевская, Л.И. Кочкар

С57 **Содружество наук. Барановичи-2005:** Материалы междунар. науч.-практ. конф. молодых исследователей, Барановичи, 22 февраля 2005 г.: В 2 ч. Ч. 2 / Редкол.: В.И. Кочурко (гл. ред.) и др.– Барановичи: УО "БарГУ", 2005.– 438 с.

ISBN 985-498-001-4
ISBN 985-498-003-0 (Часть 2)

В сборнике представлены статьи участников международной научно-практической конференции молодых исследователей "Содружество наук. Барановичи-2005", посвященные актуальным проблемам педагогики, психологии, методикам преподавания технических, экономических, юридических, гуманитарных наук.

Адресован студентам, аспирантам, учителям школ и преподавателям вузов, специалистам предприятий, организаций, учреждений соответствующего профиля.

ЧИТАЛЬНЫЙ ЗАЛ

**УДК 082(043.2)**
**ББК 94**

**ISBN 985-498-001-4**
**ISBN 985-498-003-0 (Часть 2)**

© УО "БарГУ", 2005

ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ
ФАКУЛЬТЕТ

прыродай і роднай зямлёй. У "Страшнай музыкавай песні" не менш вялікая ўнушальная сіла выклікана выяўленнем другога полюсу – непаўторнай індывідуальнасці творцы. У гэтых апавяданнях ўвасоблены міфалагічна-нацыянальныя музыкі-"арфеі".

Вацлаў Ластоўскі і Максім Гарэцкі, развіваючы літаратурную традыцыю Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, стварылі напоўненыя сімвалічным сэнсам адметныя вобразы музыкаў, што аказала ўплыў і на далейшае развіццё літаратуры.

**Літаратура**


1. Гарэцкі М. Збор твораў. У 4-х т. Т. 1. Апавяданні. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1984. – 446 с.
2. Гарэцкі М. Творы: Дзве душы: Аповесць. Апавяданні. Жартаўлівы Пісарэвіч: П'еса. Літаратурная крытыка і публіцыстыка. Лісты. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1990. – 629 с.
3. Конан У. Беларускі музыка-Арфей // Полымя. – 1992. – № 11. – С. 149–158.
4. Ластоўскі В. Выбраныя творы. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 1997. – 512 с.
5. Ненадавец А.М. Сілаю слова. Чорная і белая магія. – Мн.: Беларусь, 2002. – 350 с.


## ПЧАЛЯРСТВА Ў СІСТЭМЕ КАШТОЎНАСЦЕЙ БЕЛАРУСА (на прыкладзе паэмы Я. Коласа "Новая зямля")


**А.А. Палідавец**

Навуковы кіраўнік – А.І. Белая, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

УА "Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт", г. Баранавічы, Беларусь


У аматара прыроды ёсць дзве магчымасці пазнаёміцца з пчоламі. Гуляючы ў цёплы вясновы дзянёк па квітнеючым садзе ці духмяным лузе, ён убачыць пчол, якія энергічна працуюць на кветках. Ён можа прайсціся міма пасекі і паглядзець на пчол, што вылятаюць са сваіх хатак і вяртаюцца ў іх. Аднак калі ён яшчэ і аматар беларускай літаратуры, то мае шанец адкрыць Коласаву "Новую зямлю", а ў ёй – раздзел "Падгляд пчол".

Праца з пчоламі здольна выклікаць шматлікія радасныя пачуцці, яна ўзбагачае і духоўна ўзвышае, дазваляе лепш пазнаёміцца з жывой прыродай, а таксама выхоўвае назіральнасць, дапытлівасць, імкненне больш даведацца аб жыцці гэтых істот. Трымаць пчол і даглядаць іх – найвялікшая асалода і немалая выгода. Гэта сцвярджае Я. Колас у "энцыклапедыі жыцця" беларускага народа – паэме "Новая зямля".

Раздзел "Падгляд пчол" непасрэдна не звязаны з асноўнай сюжэтнай лініяй, але адыгрывае вялікую ролю ў раскрыцці ідэйна-тэматычнага зместу твора. Ён неабходны, каб паказаць прыгажосць і веліч народа, сцвердзіць думку аб праве працоўных быць гаспадарамі зямлі. Паэт стварае нямала светлых і радасных карцін з жыцця беларускага сялянства, у якіх паэтызуецца побыт працоўных людзей, раскрываецца іх душэўнае багацце. На думку даследчыкаў, аўтар у адным гэтым творы сказаў аб беларускім народзе больш, чым уся папярэдняя літаратура, і сказаў так, як ніхто да яго яшчэ не гаварыў [2]. Не лішне нагадаць, што Я. Колас – вялікі патрыёт беларускага краю, аматар яго непаўторнай красы, таму прырода ва ўсіх яе іпастасях – цэнтральная гераіня і дзейсная дзеючая асоба "Новай зямлі". Яна паўстае перад намі прыгожая і разнастайная.

Парэчча – слаўная мясціна,
Куток прыгожы і вясёлы:
Як мора – лес, як неба – долы,
Зіхціць у кветках лугавіна...

"Ну, як тут пчол не завясці!" – ускліквае паэт. Тым больш, як сцвярджаюць прыказкі, "пчала ведае, дзе мёд браць", "з асакі пчала мёду не носіць..."

Беларуская прырода і клімат спрыялі пчалярству, таму беларускі селянін здаўна займаецца бортніцтвам, якое ўмацоўвае здароўе і дабрабыт, гарманізуе адносіны чалавека

і прыроды. Вось і ў Міхалавай гаспадарцы "ручыцца сталі пчолкі". Аўтару вядома, што разводзіць пчол – нялёгкая справа. Для гэтага трэба быць дбайным гаспадаром. Аднак сям'я палясоўшчыка вялікая, працавітая і дружная, у ёй адчуваецца дастатак – сама гэтая сям'я ў пэўнай ступені нагадвае пчаліную сваім укладам. У ёй няма трутняў. Але нават для здольнага да працы дзядзькі Антося пчалярства – "гэта новая навука – на першых часах была мука", пра што Я. Колас апавядае нам дэталёва і з уласцівым яму гумарам. Яскравасці малюнка спрыяе ўдала выкарыстаны прыём антытэзы, які ўзмацняе экспрэсіўнасць выказвання: "А патрывожаныя пчолы спяваюць хорам, як анёлы, але кусаюць па-чартоўску... " З пчоламі, нагадвае нам Я. Колас, трэба паводзіцца па-добраму, па-сяброўску, бо гэтая істота не любіць ні зайздрасці, ні злосці.

Паводле народнай прыкметы, да першага "мядовага Спаса" пчолы перастаюць насіць мядовыя ўзяткі. У гэты дзень звычайна падразаюць соты.

Тым часам Спас святы мінуўся...
Раі ўзмужнелі маладыя
І мёду троху нанасілі.
Дык вось кумоў і запрасілі
На гэты дзень падгледжваць пчолы.

Кумы – гэта асобы, якія прымалі ўдзел у супольным набыцці пчол. Да прыходу гасцей усе дамашнія прыбраліся і па-гаспадарску падрыхтаваліся: "мужчыны зранку падгаліліcь", "у ночвах голавы памылі", "вусы спрытна падкруцілі". "На гэты дзень і сама хата была прыбрана зухавата". Паэт па-майстэрску перадае святочны настрой героям паэмы. Пакрысе збіраюцца госці, ды не з пустымі рукамі: "Там і гарэлка-весялуха, і каравай, і сыр , як плаха". Самі госці – людзі ўдалыя і цікавыя: Язэп, "ва ўсім прыкладны, акуратны", "Кандрат жартлівы быў мужчына і каля пчолак хадзіў смела..." Мужчыны ідуць на пасеку па мёд, узяўшы ўсе патрэбныя прылады, памаліўшыся святому Мікодыму.

Кожная пчала добра ведае сваю справу і рупліва працуе ўвесь год. Але і ад гаспадара залежыць "мядовы ўраджай", бо пчол развадзіць, як сведчыць прыказка, – не разявіўшы рот хадзіць. У добрага пчаляра няма дрэннага года.

– Насілі, бедныя, збіралі, –
А мы ў мінуту ўсё забралі, –
Тут пчолкам шчыра спагадаюць.

Тым не менш "пчаляры" падглядаюць вулей за вуллем, пакуль не назбіраюць "ночвы мёду". Пасля гэтага наступае "найцікавейшая часіна". Колас так паэтызуе падзею, што ў чытача міжволі ўзнікае жаданне трапіць за сялянскі стол, дзе:

Сыр, як першы снег, бялюткі
Каўбас прыемнейшыя скруткі,
Што толькі ёсць у Беларусі.

Гэты стол як заможная Беларусь у мініяцюры. Эпітэты, ужытыя паэтам, бадай, лепшыя, якія можна падабраць для яго характарыстыкі. Колас нават шкадуе, што гэтай часінаю не спаткаўся з Я. Купалам, "каб стол сялянскага банкету развесяліў душу паэту". Госці пусцілі чарку па кругу, пажадалі адзін аднаму добрага наступнага года, ураджаю і здароўя, каб можна было яшчэ сабрацца і парадавацца плёну сваёй працы.

Я. Коласу добра ўдаюцца масавыя сцэны, дзе гучаць галасы многіх людзей. Натуральна цячэ размова, разнастайныя інтанацыі, якія дакладна перадаюць настрой і пачуцці гасцей і гаспадароў. Само апісанне сялянскага банкету, маляўнічае і падрабязнае, не толькі стварае яскравае ўяўленне аб звычаях і побыце таго часу, надае апавяданню непаўторны нацыянальны каларыт, але і дапамагае зразумець характар простых людзей. На кожны выпадак у беларуса ёсць песня, трапная прыказка, прыпеўка. Усё ў яго, на першы погляд, немудрагеліста, аднак прыгожа, з вельмі дасціпным, філасофскім,

"неварожым" гумарам. Кожны з герояў – яркая індывідуальнасць, намаляваная некалькімі характэрнымі штрыхамі. Усе ж яны ў сукупнасці складаюць зборны вобраз беларускага народа з яго адметнымі нацыянальнымі рысамі. Асабліва Колас адзначае руплівасць і цярпенне нашага народа, без якіх не пойдзе ніякая справа. Беларус імкнецца жыць у згодзе з усімі, пакуль яго не зачэпяць "кіпцем за сэрца". Гэтак жа і пчала, якая не вядзецца ў ліхога чалавека.

Некалі акадэмік Бутлераў сказаў: "Пчалярства ўяўляе выгаду маральную. Яно мае да нейкай ступені выхаваўчае значэнне. Для таго каб з поспехам пчалярыць, патрэбны ўвага, акуратнасць, кемлівасць, а гэтымі якасцямі абумоўліваецца і цвярозасць". А знакаміты польскі пчаляр доктар Ян Дзяржон пісаў: "Той, хто займаецца пчалярствам не дзеля адной выгады, хто з сапраўднай любоўю даглядае пчол і ўважліва назірае за імі, той бывае амаль заўсёды добрым чалавекам, доблесным грамадзянінам і верным сябрам".

Якуб Колас яшчэ раз даў нам магчымасць упэўніцца, што менавіта такімі з'яўляюцца яго героі, якія годна прадстаўляюць увесь беларускі народ.

**Літаратура**

1. Колас Я. Новая зямля. – Мн.: Народная асвета, 1975. – С. 121–141.
2. Тамашова Л.Ф. Вывучэнне паэмы "Новая зямля" ў школе. – Мн.: Народная асвета, 1974. – С. 31–33.
3. Вераб'ёў П. Знікнуць пчолы – загінуць людзі // ЛіМ. – 2001. – № 18. – С. 5, 12.

## "ТА СТОРОНА" В РАССКАЗАХ Э.М. ФОРСТЕРА

**Л.О. Половцев**